Тихонов В. Ю.

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ОБРАЗОВАНИЯ

Konzeption der Reform der allgemeinbildenden Schule in Weißrußland

# КАНЦЭПЦЫЯ РЭФОРМЫ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

Minsk, 1996

BY
Z-1
(1,96)

МІНСК

BY Z-1(1,96)

Kancepcyja reformy ahul'naadukacyjnaj sjarednjaj školy / Ministerstvo Obrazovanija Rėspubliki Belarus', Nacional'nyj Institit Obrazovanija. - Minsk : Nacyjanal'ny Inst. Aduk., 1996. - 13 S.

Dt. Titelübers.: Reformkonzeption der allgemeinbildenden Schule in Weissrussland

98/811

Georg-Eckert-Institut BS78
1 234 040 5

BY
Z-1(1,96)

# *КАБІНЕТ МІНІСТРАЎ*
# *РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ*

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek -
98/811

## ПАСТАНОВА

21 жніўня 1996 г. № 554
г. Мінск

## АБ КАНЦЭПЦЫІ РЭФОРМЫ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У выкананне распараджэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 1996 г. за № 4 рп "Аб падрыхтоўцы да правядзення ў Рэспубліцы Беларусь рэформы агульнаадукацыйнай школы" Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Адобрыць Канцэпцыю рэформы агульнаадукацыйнай школы, распрацаваную Міністэрствам адукацыі і навукі, што дадаецца.

2. Міністэрству адукацыі і навукі па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам эканомікі і Міністэрствам юстыцыі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам да 1 лістапада 1996 г. прыняць праграму рэформы агульнаадукацыйнай школы і прадугледзець у ёй этапы правядзення падрыхтоўчай работы і непасрэдна рэформы агульнаадукацыйнай школы.

*С.ЛІНГ,*
*намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь*

У аснове канцэпцыі рэфармавання агульнаадукацыйнай школы ляжыць бачанне Рэспублікі Беларусь як тэхналагічна развітой еўрапейскай дэмакратычнай дзяржавы, у рамках якой сістэма адукацыі заклікана адыгрываць прыярытэтную ролю, служыць гарантам стабільнасці і крыніцай сацыяльна-эканамічнага развіцця.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

## *ГІСТОРЫЯ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ. ВОПЫТ РЭФАРМАВАННЯ*

Сістэма адукацыі, якая функцыянуе сёння ў Беларусі, атрымана ў спадчыну ад Савецкага Саюза. Яна мае шэраг пэўных добрых якасцяў, а разам з тым і істотныя недахопы. Прынцыпы сістэмы агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі ў асноўных рысах фарміраваліся ў 30-50-я гады. Створаная ў гэтыя гады сярэдняя агульнаадукацыйная школа характарызавалася цеснай сувяззю зместу адукацыі з навукай, высокімі патрабаваннямі да ўзроўню ведаў і фундаментальнасцю падрыхтоўкі, звязанымі ў першую чаргу з арыентацыяй выпускнікоў на паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Інтэлектуальная падрыхтоўка і выхаванне свядомай дысцыпліны з'яўляліся асноўнымі сродкамі сацыялізацыі — функцыі, якая традыцыйна з'яўляецца вядучай для сярэдняй школы. На аснове атрыманых ведаў у навучэнцаў фарміраваліся погляд на свет, разуменне месца і ролі ў жыцці грамадства.

Аднак ужо ў сярэдзіне 50-х гадоў у рабоце школы выявіліся **сур'ёзныя недахопы, якія запатрабавалі карэкціроўкі яе дзейнасці**. Значны аб'ём навучальнага матэрыялу, пераважная арыентацыя на тэарэтычную падрыхтоўку прывялі да рэзкага павелічэння адсеву вучняў старэйшых класаў, зніжэння паспяховасці.

У аснове праблем, што ўзніклі, ляжалі дзве супярэчнасці.

Пабудова сістэмы вучэбных прадметаў і іх змест з арыентацыяй на дасягненні навукі прыводзіла да перагрузкі навучальных

праграм. Адэкватнае засваенне іх станавілася ўсё больш цяжкім для большасці вучняў у адведзеныя школай тэрміны.

Акцэнт, зроблены на фундаментальную тэарэтычную падрыхтоўку ў сферы асноў навукі, ставіў пытанне аб магчымасці практычнага прымянення вучнямі атрыманых у школе ведаў. Гэтыя веды былі неабходныя пры падрыхтоўцы да атрымання вышэйшай адукацыі, але былі ў значнай ступені не патрэбныя для большасці, якая не паступала ў ВНУ.

У канцы 50-х гадоў дзяржава ў пошуках выйсця з сітуацыі, што склалася, пайшла па шляху пераарыентацыі ўсёй дзейнасці агульнаадукацыйнай школы. Задача фарміравання высокаадукаванага дысцыплінаванага грамадзяніна змянілася задачай падрыхтоўкі маладога пакалення да прафесійнай дзейнасці. Меркавалася, што ступень поўнай сярэдняй адукацыі пяройдзе да вячэрняй школы. У сувязі з гэтым была перагледжана і пашырана праграма няпоўнай сярэдняй школы. Тэрмін навучання ў ёй быў павялічаны да васьмі гадоў.

Аднак рэфармаваная школа не справілася з ускладзенымі на яе задачамі. Прамысловыя прадпрыемствы, самі вучні не былі зацікаўлены ў развіцці прафесійнага навучання ў агульнаадукацыйных школах. Вышэйшую школу не задавальняла якасць падрыхтоўкі абітурыентаў. Не была вырашана праблема перагрузкі: скарачэнне аб'ёмаў навучальных дысцыплін кампенсавалася значным ростам часу, што адводзіўся на працоўнае навучанне.

Прадпрынятае ў 1966 годзе вяртанне школы да прынцыпаў дзейнасці 50-х гадоў дазволіла школе выйсці з крызісу, але ў той жа час азначала і вяртанне базавых супярэчнасцяў. Павышэнне патрабаванняў да ўзроўню і якасці падрыхтоўкі разам з увядзеннем 10-гадовага тэрміну навучання прывялі да перагружанасці навучальных планаў і праграм. Спроба вырашыць праблему за кошт удасканалення методык не мела поспеху. Вучні аказваліся не гатовымі да засваення матэрыялаў пачатковай и сярэдняй школы. Для большасці вучняў адукацыя стала фармальнасцю, і школа пераключыла сваю ўвагу на наймацнейшых. Такім чынам

былі створаны перадумовы для раздзялення школ на масавыя і так званыя “элітарныя”. Адначасова школа пачала страчваць уласцівую ёй раней функцыю грамадзянскага выхавання.

У 1977 годзе было прынята рашэнне аб разгрузцы падручнікаў і школьных праграм ад празмерна ўскладнёнага і другаснага матэрыялу. Больш увагі стала надавацца выхаваўчай рабоце і працоўнай падрыхтоўцы. Але гэтыя меры аказаліся недастатковымі. У грамадстве спела перакананне ў тым, што без павелічэння тэрмінаў навучання немагчыма кардынальнае паляпшэнне дзейнасці агульнаадукацыйнай школы.

Менавіта па гэтым шляху пайшла рэформа 1984 года, якая намеціла пераход на 11-гадовае навучанне. Аднак вучэбную нагрузку паменшыць усё ж не ўдалося.

У другой палове 80-х гадоў узмацнілася тэндэнцыя да прафілізацыі навучання. З’явіліся розныя тыпы навучальных устаноў. Разам з тым шматстайнасць формаў навучальных устаноў, арыентацыя на вузкую спецыялізацыю ўзмацнілі тэндэнцыю да элітарызацыі сярэдняй адукацыі, яе недаступнасці для часткі вучняў. Вучэбная нагрузка вырасла з 30-32 гадзін у тыдзень да 40 і больш. Не была вырашана праблема вызначэння базавага кампанента сярэдняй адукацыі, што выклікала разнабой у падыходах да зместу і характару адукацыі.

Рэзкае павелічэнне нагрузкі дало падставу для прыняцця рашэння аб адмаўленні ад усеагульнай сярэдняй адукацыі. Аднак завяршэнне базавай (9-гадовай) школы не прадугледжвала атрымання вучнямі закончанага кола ведаў. Да таго ж 15-гадовыя выпускнікі школ фізічна, псіхалагічна, сацыяльна і маральна не гатовыя да самастойнага жыцця і дзейнасці. Па-за навучальнай установай яны апынуліся без забеспячэння прававых гарантый на працу і сацыяльную абарону. Акрамя гэтага, зніжэнне тэрмінаў абавязковай адукацыі супярэчыла як лепшым традыцыям савецкай школы, так і існуючым у свеце тэндэнцыям.

## *СУЧАСНЫ СТАН СЯРЭДНЯЙ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ*

Для сучаснай беларускай школы характэрныя як моцныя, так і слабыя рысы савецкай школьнай сістэмы. Да станоўчых бакоў адносяцца перш за ўсё аб'ём і якасць ведаў, што даюцца вучням. Школа забяспечана навучальнымі праграмамі высокага ўзроўню складанасці, з дастаткова эфектыўнымі методыкамі. Вынікі міжнародных алімпіяд наглядна дэманструюць, што па многіх параметрах наша школа не адстае, а па некаторых пераўзыходзіць сусветны ўзровень. Магутны патэнцыял беларускай школы — яе настаўніцкі корпус, ступень прафесійнай падрыхтоўкі якога дазваляе ставіць і вырашаць складаныя і маштабныя адукацыйныя задачы. Разам з тым нявырашаныя супярэчнасці, уласцівыя яшчэ савецкай школе, цягнуць за сабой і адмоўныя рысы, галоўныя з якіх:

вучэбная перагрузка, якая прыводзіць да рэзкага пагаршэння стану здароўя маладога пакалення. Рост захворванняў дзяцей ва ўмовах ускладнення дэмаграфічнай сітуацыі, агульнага пагаршэння стану здароўя ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС не можа не выклікаць трывогі;

нізкі каэфіцыент засваення ведаў, засваення навучальных праграм. Большасць вучняў не ў стане паспяваць па ўсіх прадметах, фактычна (а не фармальна) засвоіць складаны і аб'ёмны навучальны матэрыял;

з пункту гледжання сучаснай навукі мінусам з'яўляецца таксама празмерная уніфікаванасць школы. У рамках сённяшняй сістэмы недастаткова магчымасцяў для ўліку індывідуальных прыхільнасцяў і здольнасцяў вучняў. Бацькі дзіцяці, сам вучань часта пазбаўлены магчымасці выбраць профіль навучання згодна са сваімі планамі на будучыню;

недастатковая ўвага школы да праблем грамадзянскага выхавання і сацыяльнай адаптацыі школьніка ва ўмовах пастаяннага ўскладнення грамадскага жыцця вядзе да росту злачыннасці, іншых негатыўных з'яў.

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek -

Шмат нараканняў выклікае матэрыяльнае і фінансавае становішча нашай школы, у першую чаргу настаўнікаў. У апошні час намеціўся адток педагагічных кадраў з сістэмы адукацыі.

Школа аказалася не гатовай гібка рэагаваць на змяненні ў грамадстве, адэкватна адказваць на новую сацыяльна-эканамічную сітуацыю.

### *АБГРУНТАВАННЕ НЕАБХОДНАСЦІ РЭФАРМАВАННЯ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ*

За апошнія дзесяцігоддзі ў нашай краіне адбыліся вялізныя змяненні. Істотна змяніўся і свет вакол нас. І школа як найважнейшы дзяржаўны і грамадскі інстытут не можа не рэагаваць на гэтыя змяненні. Сёння ўжо нельга вучыць дзяцей таму і так, як некалькі гадоў назад. Савецкая школа стваралася згодна з патрабаваннямі грамадства таго часу, сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні патрабуюць і рэформы школы.

Аб'ём ведаў, неабходны для жыцця і дзейнасці ў грамадстве, з кожным годам усё расце, і спробы падагнаць яго да існуючых у нашай школе тэрмінаў навучання прыводзяць да непажаданых наступстваў, перагрузкі, празмернай складанасці навучальных праграм, незасваення матэрыялу. Павелічэнне тэрмінаў навучання, якое адпавядае агульнасусветнай тэндэнцыі развіцця адукацыі, павінна часткова вырашыць гэтую праблемную сітуацыю, але не знімае яе цалкам. Неабходна ствараць новыя вучэбныя прадметы, якія будуць грунтавацца на практычнай арыентацыі навучання, прыкладным характары ведаў. Прыярытэтнымі становяцца тыя галіны ведаў, якія могуць быць выкарыстаны вучнямі ў жыцці і прафесійнай дзейнасці.

Неабходнасць адмаўлення ад жорстка уніфікаванай школы, пераходу да дыферэнцыяванай, асобасна арыентаванай адукацыі, спецыялізацыі на старэйшай ступені навучання даволі даўно ўсведамляецца як педагогамі, так і ў грамадстве (вучнямі, бацькамі). Сведчаннем гэтага з'яўляецца ўзнікненне спецыяльных школ і

класаў, на больш познім этапе — стварэнне навучальных устаноў новага тыпу: ліцэяў, гімназій. Асаблівай праблемай пры ўвядзенні дыферэнцыяванага навучання з'яўляецца вызначэнне аптымальных суадносін паміж зместам, які ўстанаўліваецца дзяржаўным стандартам, і зместам, які з'яўляецца прадметам самастойнага выбару навучальнай установай, педагогам, а таксама згодна з пажаданнямі дзіцяці і яго бацькоў. Ступеньчатасць сістэмы адукацыі, разнастайнасць тыпаў навучальных устаноў, злучаных у адзіную структуру з дзейнаснымі механізмамі пераходу паміж рознымі звёнамі, дазволіць забяспечыць аптымальны характар спалучэння агульнадзяржаўнай і індывідуальнай састаўляючых адукацыі.

## МЭТЫ І ПРЫНЦЫПЫ РЭФОРМЫ

### *МЭТЫ І АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ РЭФОРМЫ*

Вывад дзяржаўнай сістэмы адукацыі на ўзровень, які адпавядае лепшым сусветным узорам.

Гуманізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу ў мэтах задавальнення адукацыйных і духоўных запытаў асобы з улікам яго індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей, ажыццяўленне гуманістычнага прынцыпу: не чалавек для адукацыі, а адукацыя для чалавека.

Павышэнне прэстыжу адукацыі, рэальнае замацаванне за сферай адукацыі статуса прыярытэтнасці для дзяржавы і грамадства.

*Асноўнымі накірункамі рэфармавання павінны стаць:*

пераход да аптымальных тэрмінаў навучання ў агульнаадукацыйнай сярэдняй школе;

пераход на новы змест і тэхналогіі адукацыі, вызначэнне базавага кампанента агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, які б забяспечваў умовы для гарманічнага развіцця асобы;

змяненне арганізацыйнай структуры сярэдняй школы ў мэтах яе лепшага прыстасавання для сучасных умоў;

пераход да прафілявання падрыхтоўкі на завяршаючым этапе атрымання агульнай сярэдняй адукацыі;

фарміраванне механізма самаразвіцця школы, адэкватнага і своечасовага рэагавання на зменлівыя ўмовы.

### *ПРЫНЦЫПЫ РЭФАРМАВАННЯ*

Асноўнымі прынцыпамі рэфармавання з'яўляюцца:

даступнасць адукацыі, роўнасць правоў кожнага грамадзяніна на атрыманне адукацыі, незалежна ад нацыянальнай, рэлігійнай, сацыяльнай прыналежнасці, месца жыхарства і матэрыяльнага становішча;

сумяшчэнне нацыянальна-культурнай і рэгіянальнай асновы адукацыі з арыентацыяй на засваенне вышэйшых дасягненняў нацыянальнай і сусветнай культуры;

гуманізацыя, гуманітарызацыя і дэмакратызацыя адукацыі;

адзінства адукацыйных і выхаваўчых задач;

варыянтнасць шляхоў атрымання адукацыі;

ахова здароўя маладога пакалення;

бесперапыннасць адукацыі і пераемнасць яе ступеняў.

## МАДЭЛЬ БУДУЧАЙ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

### *АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ*

Канцэпцыя рэформы зыходзіць з таго, што асноўнымі задачамі агульнаадукацыйнай школы з'яўляюцца: падрыхтоўка маладога пакалення да паўнацэннага жыцця і дзейнасці ў грамадстве; навучанне дзяцей быць шчаслівымі ў сваёй краіне, сваёй сям'і, сваёй прафесіі; фарміраванне разумення, што мы жывём у зменлівым свеце і неабходна быць падрыхтаваным да змен рознага роду; перадача фундаментальных асноў нацыянальнай і сусветнай культуры, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы.

## *ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ І АРГАНІЗАЦЫІ НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ*

Прынцыповым пытаннем для школы з'яўляецца пытанне зместу адукацыі. Яго вырашэнне залежыць ад канкрэтных распрацовак у галіне стварэння новых вучэбных прадметаў і мадэрнізацыі існуючых, падрыхтоўкі новых падручнікаў, навучальных курсаў і праграм. Да гэтай работы прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:

аптымальнае спалучэнне фундаментальных ведаў з практыкаарыентаванымі, практычная накіраванасць прыродазнаўчых і прыродазнаўчанавуковых дысцыплін у базавай школе;

ліквідацыя вучэбнай перагрузкі праз вызначэнне базавага кампанента ў рамках зацверджаных дзяржавай стандартаў, стварэнне інтэграваных курсаў, аптымізацыі педагагічных тэхналогій;

прыярытэт індывідуальнага падыходу да навучання, асобасна арыентаванай парадыгмы, якая дазваляе гібка рэагаваць на адукацыйныя запытанні вучня;

мадэрнізацыя сістэмы ацэнкі ведаў вучняў у накірунку яе гуманізацыі;

пабудова выхаваўчай работы на культуралагічнай аснове, стаўленне да нацыянальнай і сусветнай культуры як да зместу выхавання; грамадзянскі, патрыятычны, экалагічны характар выхавання.

## *СТРУКТУРА 12-ГАДОВАЙ АГУЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ*

Структура, што прапануецца, адпавядае патрабаванням стварэння цэласнасці сістэмы адукацыі, накіравана на стварэнне аптымальных умоў для сацыялізацыі асобы, яе інтэлектуальнага, маральнага, творчага і псіхафізічнага развіцця.

Пачатковая школа (падрыхтоўчы, 1-3 класы, з 6 да 10 гадоў) ставіць перад сабой дзве задачы:

заахвочванне і развіццё ўстойлівай цікавасці да навучання, да ведаў, засваенне дзіцем базавых навыкаў дзейнасці вучэння — умення вучыцца;

фарміраванне асноў агульнай пісьменнасці, якая дазваляе працягваць далейшае навучанне.

Навучанне па праграме 1-га класа можна праходзіць як у школе, так і ў рамках дзіцячага сада.

Базавая (асноўная) сярэдняя школа (4-9 класы; 10 да 16 гадоў) нясе на сабе асноўную нагрузку па рэалізацыі задач агульнаадукацыйнай школы, падрыхтоўцы дзяцей да жыцця ў грамадстве. Праграма базавай школы характарызуецца лагічнай завершанасцю і паўнатой кола ведаў, што даюцца ў рамках дзяржаўнага стандарту. Выпускнік павінен атрымаць веды, якімі ён будзе карыстацца ў жыцці, незалежна ад абранай прафесіі і далейшай адукацыі ці прафесійнай падрыхтоўкі. Школа павінна сфарміраваць уяўленні аб шляхах магчымага выбару, даць вучню сродкі для яго ажыццяўлення, дапамагчы яму раскрыць і развіць здольнасці, паказаць магчымасці іх аптымальнага прымянення. Асаблівай задачай з'яўляецца грамадзянскае выхаванне, фарміраванне ведаў аб дзяржаве, грамадстве, падрыхтоўка да выканання грамадзянскіх функцый.

Рэалізацыя гэтых задач дасягаецца на аснове засваення вучнямі базавага кампанента сярэдняй адукацыі. З 6-7 класаў магчыма ўвядзенне розных узроўняў падрыхтоўкі (паглыбленага вывучэння асобных прадметаў), у 8-9 класах — прафіляванне падрыхтоўкі (прыродазнаўчанавуковы, гуманітарны, політэхнічны профілі, сферы мастацтва і спорту і іншых напрамкаў).

Паспяховае заканчэнне 9-гадовай школы і праходжанне дзяржаўнай атэстацыі дае права на працяг адукацыі па наступных накірунках: атрыманне прафесійнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі ў ПТВ ці сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе, агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі ў ліцэйскіх класах.

Ліцэйскія класы (тэрмін навучання — 2 гады) ставяць перад сабой задачу працягу агульнай сярэдняй адукацыі і падрыхтоўкі да вышэйшай адукацыі. Мяркуецца стварэнне наступных арганізацыйных форм навучання:

ліцэйскія класы розных напрамкаў у рамках сярэдніх агульнаадукацыйных школ, як III ступень агульнай сярэдняй адукацыі;

самастойныя навучальныя ўстановы (гімназіі, ліцэі і інш.) прыродазнаўчага, політэхнічнага, гуманітарнага і інш. напрамкаў;

ліцэі пры вышэйшых навучальных установах, падрыхтоўка ў якіх адпавядае профілю ВНУ (гэтыя навучальныя ўстановы будуць выконваць і функцыю сацыяльнай падтрымкі сельскай і працоўнай моладзі, аналагічную функцыю падрыхтоўчых аддзяленняў).

Паспяховае завяршэнне ліцэйскага ці гімназічнага цыкла навучання дае права на паступленне ў ВНУ.

### *АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА Ў СІСТЭМЕ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ*

Прафесійна-тэхнічная адукацыя (пачатковая прафесійная школа) дае магчымасць атрымаць кваліфікацыю, неабходную для прафесійнай дзейнасці. Навучанне ў сярэдніх ПТВ (на працягу 2-3 гадоў) прадугледжвае таксама атрыманне поўнай адукацыі (роўнай статусу ліцэйскай) з правам далейшага паступлення ў ВНУ. Вышэйшыя ПТВ будуць мець права працягваць курс навучання для сваіх навучэнцаў і выдаваць дыпломы, роўныя дыпломам тэхнікумаў.

Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Тэхнікумы, каледжы на працягу 3-4 гадоў рыхтуюць спецыялістаў сярэдняга звяна з завяршэннем агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі. Заканчэнне тэхнікума ці каледжа дае права паступлення ў ВНУ (у выпадку навучання па той жа спецыяльнасці — на скарочаны (спецыяльны) курс), у вышэйшых каледжах можна будзе атрымаць першую (бакалаўраўскую) ступень вышэйшай адукацыі.

## СТРАТЭГІЯ РЭФАРМАВАННЯ

Стратэгія рэфармавання, якая ўключае прававое, арганізацыйна-кіраўніцкае, навукова-метадычнае, кадравае, матэрыяльна-тэхнічнае і іншае забеспячэнне рэфармавання, а таксама асноўныя падпраграмы рэформы і этапы яе правядзення будуць адлюстраваны ў праграме рэфармавання агульнаадукацыйнай школы.

Фармат 60x84 1/16. Заказ [illegible]

Нацыянальны інстытут адукацыі
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Ліцэнзія № 481.
220004, Мінск, вул. Караля, 16.

---

Надрукавана на ратапрынце НІА.
Пры ўдзеле ВК ТАА "Полібіг". Ліцэнзія № 894.
220004, Мінск, вул. Караля, 16.